ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 14 (988) | АЎТОРАК, 10 кастрычніка 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З'ЕЗД ДЭЛЕГАТАЎ НАРОДА

Скліканы 29 верасня па ініцыятыве Прэзідэнта краіны З'езд дэпутатаў усіх узроўняў стаў адной з цэнтральных падзей адыходзячага года. Народ накіраваў на яго каля дзвюх з палавінай тысяч дэлегатаў. Правядзенне З'езда, як не раз адзначаў Аляксандр Лукашэнка, прадыктавана неабходнасцю ўсенароднай падтрымкі шырокай грамадскай ініцыятывы насельніцтва, павышэння сацыяльна-палітычнай актыўнасці грамадзян, рэалізацыі ідэй сацыяльнай прававой дзяржавы, вырашэння важных дзяржаўных праблем у духу грамадзянскай згоды.

Прадстаўнікі вышэйшых органаў улады ўважліва выслухоўвалі думкі дэлегатаў ад народа. Менавіта іх слова стала камертонам агульнай палітычнай сітуацыі ў краіне, якая склалася напярэдадні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Прысутнасць на З'ездзе кіраўнікоў дыпламатычных місій і замежных гасцей надало гэтаму мерапрыемству і міжнародны каларыт. Яны сталі непасрэднымі сведкамі прыхільнасці кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь да традыцый народаўладдзя, дэмакратычных прынцыпаў кіравання, адкрытасці перад светам.

**БЕЛТА.**

***

У рабоце З'езда прыняла ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя — 340 чалавек — Гомельскай вобласці. Вышэйшую школу на гэтым усебеларускім форуме прадстаўляў рэктар нашага універсітэта, старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны прафесар М.В.Селькін. Аб выніках работы З'езда дэпутат Міхаіл Васільевіч падрабязна расказаў 2-га кастрычніка на пасяджэнні рэктарата.

## З УДЗЕЛАМ МІНІСТРА АДУКАЦЫІ

У канцы другой дэкады верасня наш універсітэт наведаў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І.Стражаў. Пры яго ўдзеле і у прысутнасці начальніка ўпраўлення адукацыі аблвыканкама А.В.Лук'яновіча абмеркаваны пытанні рэгіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў і фінансавання ВНУ на наступны год. Галоўная ўвага па гэтых жыццёва важных праблемах была сканцэнтравана ў выступленні рэктара ГДУ, старшыні Савета рэктараў Гомельшчыны прафесара М.В.Селькіна.

Міністр адукацыі В.І.Стражаў і старшыня Савета рэктараў М.В.Селькін правялі пасяджэнні Саветаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту і Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога. У ходзе гэтых сустрэч адбылася дзелавая размова аб надзённых задачах, якія стаяць перад названымі ВНУ.

15-га кастрычніка -- выбары

## КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТА

**Вучэбныя карпусы і інтэрнаты нашага універсітэта размяшчаюцца на тэрыторыі двух выбарчых акруг па выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Знаёмім выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты па гэтых выбарчых акругах.**

**ГОМЕЛЬСКАЯ — ЮБІЛЕЙНАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 33**

**КІРЫЕНКА Уладзімір Адамавіч** — юрыст навукова-вытворчага пазаарэнднага малога прадпрыемства "Саір", член Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

**КАЛЕСНІКАЎ Сяргей Дзмітрыевіч** — намеснік упраўляючага дзяржаўным прадпрыемствам "Трэст Гомельсаўгасбуд", беспартыйны.

**КАСЦЮКЕВІЧ Валерый Яўгенавіч** — намеснік старшыні гаспадарчага суда Гомельскай вобласці, беспартыйны.

**ЛОГВІН Валерый Мікалаевіч** — галоўны рэдактар абласной газеты "Гомельская праўда".

**ПІНЧУК Адам Пятровіч** — прафесар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, член Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

**ГОМЕЛЬСКАЯ — ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА №35**

**БАРАНАЎ Аляксандр Пятровіч** — загадчык юрыдычнай кансультацыяй Чыгуначнага раёна г.Гомеля, член Партыі народнай згоды.

**ВВЕДЗЕНСКІ Данііл Усеваладавіч** — загадчык кафедры акушэрства і гінекалогіі Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, член Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

**ДЗЕРВЯНКОЎ Уладзімір Іванавіч** — кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля, беспартыйны.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер верасня адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Аб выніках работы навукова-метадычнага савета універсітэта за 1999-2000 навучальны год і асноўных задачах на новы навучальны год далажыў намеснік старшыні навукова-метадычнага савета, дэкан завочнага факультэта М.Н.Мурашка.

Прынята рашэнне аб вылучэнні на заахвочванне Саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь загадчыка кафедры экалогіі дацэнта А.М.Кусянкова за асабісты ўклад у работу са здольнымі навучэнцамі і студэнтамі і студэнцкага творчага клуба "Электроніка" (кіраўнік — ст.выкладчык кафедры агульнай фізікі І.М.Якаўцаў).

За выдатны ўклад у развіццё вышэйшай адукацыі прафесары загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання І.В.Максімей і загадчык кафедры беларускай мовы А.А.Станкевіч рэкамендаваны на атрыманне персанальнай надбаўкі да заработнай платы.

У адпаведнасці з парадкам дня зацверджаны план работы Савета універсітэта на бягучы навучальны год, вырашаны некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## АЛІМПІЙСКІ МЕДАЛЬ НАШАЙ ВЫПУСКНІЦЫ



У аўстралійскім горадзе Сіднеі завяршыліся летнія Алімпійскія гульні. Яны ўжо сталі здабыткам спартыўнай гісторыі. Але і цяпер многія аматары розных відаў спорту працягваюць абмяркоўваць вынікі напружанай барацьбы за вышэйшыя ўзнагароды чатырохгадовага цыклу.

Для нас вельмі прыемным стала пасяховае выступленне выпускніцы факультэта фізічнай культуры ГДУ Наталлі Сазановіч. Як вядома, свой першы алімпійскі медаль у сямібор'і — сярэбраны — яна заваявала на папярэдняй алімпіядзе, якая праходзіла ў амерыканскай Атланце. Вялікія спадзяванні ўскладваліся на Наталлю і на гэты раз, хаця яна ўжо стала маці.

Адна з мацнейшых шматборак планеты спадзяванні сваіх балельшчыкаў апраўдала з гонарам. Пасля пяці відаў праграмы яна апярэджвала сваю бліжэйшую канкурэнтку на 57 ачкоў. І толькі адносная няўдача ў кіданні кап'я не дазволіла таленавітай спартсменцы, заслужанаму майстру спорту Рэспублікі Беларусь Наталлі Сазановіч узняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. На радзіму яна вярнулася з бронзавым медалём. Але і гэта дасягненне трэба расцэньваць як яе сапраўдны спартыўны подзвіг.

## *У ЧАКАННІ СВЯТА МАСТАЦТВА*

***Крыху больш двух тыдняў застаецца да адкрыцця ў нашым універсітэце чарговага, ужо чацвёртага па ліку, Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія". Гэта будзе сапраўднае свята мастацтва і дружбы, на якое збяруцца шматлікія творчыя калектывы краін СНД, а таксама з далёкага замежжа.***

**ПРАГРАМА МІЖНАРОДНАГА МАЛАДЗЁЖНАГА ФЕСТЫВАЛЮ, ГОМЕЛЬ — 2000**

**26 кастрычніка, чацвер**

18.00. Урачыстае адкрыццё IV Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія", Гомель — 2000. (Гомельскі абласны драматычны тэатр).

**27 кастрычніка, пятніца**

12.00. Канцэрты ў ВНУ горада. Вучылішча імя Выгоцкага.

18.00. Гала-канцэрт замежных калектываў для жыхароў г.Гомеля. (ГЦКіА, вул Першамайская, 16)

18.00. Гала-канцэрт маладзёжных музычных рок-груп "Музыка без межаў" (Акт.зала МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

20.00. Маладзёжная дыскатэка (КЦ "Юбілейны", вул.Юбілейная, 9).

**28 кастрычніка, субота**

17.00. Конкурс "Студэнцкае брацтва" сярод ВНУ горада. (Акт. зала МК ГДУ, вул. Савецкая, 108).

18.00. Гала-канцэрт удзельнікаў фестывалю "Славянскі вянок" (ГЦКіА, вул.Першамайская, 16).

20.00. Маладзёжная дыскатэка (Фае МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

**29 кастрычніка, нядзеля**

18.00.Канцэрт лаўрэатаў агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік!: "Свята, якое заўсёды з намі" (Акт.зала МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

20.00. Маладзёжная дыскатэка (Фае МК ГДУ, вул. Савецкая, 108).

18.00. Гала-канцэрт удзельнікаў фестывалю перад працоўнымі калектывамі г.Гомеля і вобласці (ГЦКіА, вул. Першамайская,16). (Па запрашальных білетах).

**30 кастрычніка, панядзелак**

10.00. Адкрыццё выставачнай залы "Арт-Салона" (Выставачная зала ГДУ, вул.Савецкая, 104).

12.00. Канцэрты замежнага калектыву ў вучылішчы №126, імя Сакалоўскага.

19.00. Сюрпрыз аргкамітэта фестывалю для яго ўдзельнікаў і жыхароў горада (ГКЦ, вул.Ланге,17).

**31 кастрычніка, аўторак**

18.00. Урачыстае закрыццё IV Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія", Гомель -- 2000 (Акт.зала ГДУ, вул. Савецкая, 108).

**(ЗАКАНЧЭННЕ на 2-й стар.)**

## *ВІНШУЕМ!*

***За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры оптыкі КАЗАКОЎ Мікалай Паўлавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

# У чаканні свята мастацтва

**(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 1-й стар.)**

**1 лістапада, серада**

12.00. Работа выставачных залаў: "Саюза мастакоў" і "Паляўнічага доміка".

16.00. Сустрэчы з цікавымі людзьмі — Сяргей Мароз.

18.00. Старонкі паэзіі. Літаратурна-музычная гасцёўня.

**2 лістапада, чацвер**

13.00. Выстаўка мастакоў. Сустрэчы з кампазітарамі, паэтамі, мастакамі.

16.00. Навукова-практычная канферэнцыя "Духоўная спадчына беларусаў і Чарнобыль".

19.00. Урачыстае адкрыццё "Арт-салона" (Акт.зала МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

**3 лістапада, пятніца**

18.00. Маладзёжная дыскатэка для школьнікаў 10-11 класаў, ПТВ (КЦ "Юбілейны", вул. Юбілейная, 9).

19.00. Маладзёжная студэнцкая дыскатэка (Фае МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

19.00. Вечар прэм'ер. Спектакль канцэптуальнай харэаграфіі (ГЦКіА, вул.Першамайская, 16).

**4 лістапада, субота**

19.00. Візітная картка "Арт-салона". Паказ калекцый адзення маладых мастакоў-мадэльераў г.Гомеля (Акт.зала МК ГДУ, вул.Савецкая, 108).

19.00. Маладзёжная дыскатэка (КЦ "Юбілейны", вул.Юбілейная, 9).

**5 лістапада, нядзеля**

10.00. Наведванне выставы "Свет у пачатку новага стагоддзя..." (Выставачная зала ГДУ, вул.Савецкая, 104).

18.00. Фестываль бардаўскай песні (Акт. зала МК ГДУ, вул. Савецкая, 108).

20.00. Маладзёжная дыскатэка (Фае МК ГДУ, вул. Савецкая, 108).

**6 лістапада, панядзелак**

18.00. Закрыццё "Арт-Салона" у выставачнай зале МК ГДУ, вул.Савецкая, 104).

**АРГКАМІТЭТ ММФ.**

*Канферэнцыі*

## АБМЕРКАВАЛІ ВУЧОНЫЯ І СПЕЦЫЯЛІСТЫ

Інстытут механікі металапалімерных сістэм імя У.А.Белага Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правёў міжнародную навукова-тэхнічную канферэнцыю "Палімерныя кампазіты-2000" і 4-ю рэспубліканскую навукова-тэхнічную канферэнцыю "Матэрыялы, тэхналогіі — 2000". У іх рабоце прынялі ўдзел 300 вучоных і спецыялістаў з Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа.

Членам аргкамітэта першай з названых канферэнцый быў прарэктар нашага універсітэта па навуковай рабоце д.т.н., прафесар Д.Р.Лін. Ён жа выступіў з трыма дакладамі.

На рэспубліканскую канферэнцыю ад ГДУ было прадстаўлена 14 навуковых дакладаў супрацоўнікаў праблемнай лабараторыі, якую ўзначальвае д.т.н., прафесар І.М.Мельнічэнка.

У ходзе работы канферэнцыі абмеркаваны фундаментальныя і прыкладныя аспекты сучаснага матэрыялазнаўства, тэхналогіі атрымання новых матэрыялаў і вырабаў з іх.

*Прафсаюзнае жыццё*

## У ГАСЦЯХ УНІВЕРСІТЭТА-ЮБІЛЯРА

**На працягу больш дзесяці гадоў дзейнічае Еўразійская асацыяцыя прафсаюзных арганізацый універсітэтаў (ЕАПАУ), якая атрымала такую назву параўнальна нядаўна (дагэтуль гэта быў Савет старшынь прафкомаў класічных універсітэтаў СССР, затым Міжнародная асацыяцыя прафсаюзных арганізацый універсітэтаў (МАПАУ).**

На сённяшні дзень яна аб'ядноўвае 69 універсітэтаў класічнага тыпу краін СНД, яе прэзідэнтам абраны старшыня аб'яднанага прафсаюзнага камітэта МДУ імя М.В.Ламаносава І.Б.Катлабоўскі. Мэта асацыяцыі — абмен вопытам паміж яе членамі ў абароне правоў членаў прафсаюза, рэалізацыі сацыяльных праграм, а таксама прапаганда ідэй захавання і развіцця адзінай адукацыйнай прасторы як важнага фактара ўзмацнення эканамічнай інтэграцыі краін СНД і стабілізацыі іх сацыяльна-эканамічнага становішча.

Паўнапраўным членам ЕАПАУ з'яўляецца і наш універсітэт, на базе якога ў верасні 1991 года праходзіў IV па ліку з'езд асацыяцыі.

Нядаўна старшыні прафкомаў 39 універсітэтаў краін СНД збіраліся ў чарговы раз, каб абмеркаваць надзённыя пытанні дзейнасці ЕАПАУ. Іх гасцінна прымаў у сваіх сценах Кубанскі дзяржаўны універсітэт, які адзначаў у верасні свой 80-гадовы юбілей. Сёння ён з'яўляецца цэнтрам адукацыі, навукі і культуры Краснадарскага краю. У ім вучыцца больш 13 тысяч студэнтаў, тут створаны высокі навуковы патэнцыял (ёсць аспірантура і дактарантура), тры гады назад адкрыўся філіял КубДУ з пяццю факультэтамі ў г.Новарасійску. Адзін з іх — мастацка-графічны — пакуль адзіны ў складзе класічных універсітэтаў краін СНД.

Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта-юбіляра прымаў шчырыя віншаванні са знамянальнай датай ад дэлегатаў з'езда ЕАПАУ, у тым ліку ад старшынь прафкомаў ГДУ Г.І.Варатніцкага і Н.І.Колтышавай, якія ўручылі кіраўніцтву КубДУ прывітальны адрас і каштоўны сувенір.

На з'ездзе была заслухана справаздача Прэзідыума аб рабоце ЕАПАУ, перарэгістрацыі асацыяцыі, абмеркаваны іншыя арганізацыйныя пытанні. Адбылася таксама семінар па электронных сродках інфармацыі ў прафсаюзнай рабоце. У Інтэрнэце распрацаваны і апублікаваны сайт ЕАПАУ, які ўключае спіс і карту ўдзельнікаў асацыяцыі, у тым ліку і ГДУ, яе Статут, іншую даведніцкую інфармацыю, наладжаны каналы электроннага абмену дадзенымі.

**Т.ДУБЯК.**



**Сёлета ў нашым універсітэце шырока і ўрачыста адзначаны 80-гадовы юбілей аднаго з самых вядомых у краіне вучоных у галіне педагогікі доктара педагагічных навук, прафесара, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, загадчыка кафедры педагогікі І.Ф.Харламава. У выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і шматлікіх гасцей вялікую цікавасць выклікала выстаўка яго навуковых прац.**

**На здымку: І.Ф.Харламаў (злева) і ганаровы прафесар універсітэта, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў, які знаёміцца з выстаўкай навуковых прац юбіляра.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# ВЫТОКІ ПЛЁННАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**По прадстаўленні рэктарата Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны старшыня Рэчыцкага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай Мікалаевіч Заразака ўзнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Гэты выпадак ды і сама ініцыятыва ГДУ не зусім звычайныя, таму за каментарыем мы звярнуліся да прарэктара па навуковай рабоце прафесара Дзмітрыя Рыгоравіча ЛІНА.**

**— Што з'явілася падставай для такога хадайніцтва нашага універсітэта?**

— Падставай сталі вынікі плённага супрацоўніцтва ГДУ і Рэчыцкага гарадскога выканаўчага камітэта па навуковаму вывучэнню і ўшанаванню памяці выдатнага вучонага-славіста, ураджэнца г.Рэчыцы М.В.Доўнар-Запольскага, якое вядзецца ўжо больш як тры гады. Пачатак яму паклала падтрымка М.М.Заразакам нашай прапановы адзначыць на радзіме 130-годдзе славутага земляка. У выніку ў Рэчыцы быў адкрыты помнік вучонаму і праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя, якая засведчыла зацікаўленасць даследчыкаў і грамадскасці не толькі Беларусі, але таксама Расіі і Украіны ва ўключэнні спадчыны М.В.Доўнар-Запольскага ў сучасны навукова-культурны кантэкст. Дзеля надання такой працы мэтанакіраванасці і яе фінансавай падтрымкі ў красавіку 1999г. быў падпісаны пратакол намераў аб супрацоўніцтве паміж ГДУ і Рэчыцкім выканкамам, выкананне якога ўжо прынесла плённыя вынікі і вызначыла перспектыўны накірунак навукова-даследчыцкай работы.

**— Дзмітрый Рыгоравіч, раскажыце, калі ласка, аб гэтым больш падрабязна.**

Перш за ўсё, для актывізацыі даследчыцкай работы студэнтаў і маладых вучоных усталяваны дзве імянныя стыпендыі для студэнтаў эканамічнага і гістарычнага факультэтаў, а таксама спецыяльны аспіранцкі грант з бюджэту Рэчыцкага гарвыканкама. У верасні мінулага года ў Рэчыцы прайшлі Другія міжнародныя навуковыя Доўнараўскія чытанні, распачынаецца падрыхтоўка да Трэціх, што запланаваны на 2001 год. Зусім нядаўна пабачыў свет зборнік артыкулаў "Даследчык гісторыі трох народаў: М.В.Доўнар-Запольскі", заканчваецца падрыхтоўка да друку біяграфічна-бібліяграфічнага даведніка аб вучоным, праведзена навукова-археаграфічная апрацоўка архіўнага рукапісу Доўнар-Запольскага "История Белоруссии" і дасягнута дамоўленасць аб яго выданні выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя". Уся гэта работа вядзецца пры чынным арганізацыйным і каардынацыйным удзеле М.М.Заразакі і фінансавай падтрымцы Рэчыцкага гарвыканкама.

Акрамя гэтага, выкананне пратакола дазволіла ГДУ наладзіць сур'ёзныя навуковыя сувязі і супрацоўніцтва з даследчыцкімі ўстановамі і навукоўцамі як у межах Беларусі, так і міжнародныя. Гэта датычыць не толькі Доўнараўскіх чытанняў, у якіх ужо прынялі ўдзел больш 40 даследчыкаў з Гомеля, Мінска, Гродна, Мазыра, Кіева, Масквы, Бранска. Мы лічым поспехам заключэнне дагавора аб навуковым супрацоўніцтве паміж ГДУ імя Ф.Скарыны, Бранскім дзяржаўным універсітэтам імя Пятроўскага і Украінскім навукова-даследчым інстытутам справаводства і архіўнай справы, у межах якога распачата двухгадовая праграма даследавання творчай спадчыны М.В.Доўнар-Запольскага ў кантэксце гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў. Да ўдзелу ў выкананні гэтай праграмы прыцягнуты, акрамя навуковых сіл ГДУ і нашых партнёраў на Украіне і ў Расіі, таксама даследчыкі з Белдзяржуніверсітэта, Нацыянальнага архіва і Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага навукова-асветніцкага Цэнтра імя Ф.Скарыны, Беларускага навукова-даследчага інстытута архіўнай справы і справаводства.

**— Такім чынам, закладзеныя ў пратаколе намеры ўжо сталі справамі, што і засведчыла Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ці азначае гэта вычарпанасць супрацоўніцтва з Рэчыцкім гарвыканкамам?**

— Наадварот, мы нават не лічым закончаным яго першы этап, бо супрацоўніцтва па даследаванню і ўшанаванню памяці М.В.Доўнар-Запольскага будзе працягнута. Ёсць двухбаковая зацікаўленасць разгарнуць вывучэнне гісторыка-краязнаўчай і культурна-рэгіянальнай праблематыкі. Першым крокам да гэтага можна лічыць правядзенне ў Рэчыцкім раёне фальклорнай практыкі студэнтаў-філолагаў пад кіраўніцтвам дацэнта В.С.Новак. Сабраныя імі запісы рыхтуюцца да выдання асобным зборнікам. Краязнаўчая тэматыка мяркуецца да ўключэння ў праграму Трэціх Доўнараўскіх чытанняў.

Новы крок, здзейснены ўжо ў гэтым навучальным годзе, — падрыхтоўка да сумеснага прыёму дэлегацыі шведскага горада-пабраціма Рэчыцы Трэлеборга, якая прыязджае з мэтай вывучэння экалагічных праблем і знаёмства з вопытам іх вырашэння ў Рэчыцкім рэгіёне. Плануецца правядзенне семінара з удзелам навукоўцаў нашага універсітэта. У яго праграму мы прапанавалі азнаямленне з асноўнымі накірункамі экалагічных даследаванняў, якія вядуцца ў ГДУ імя Ф.Скарыны і іншых ВНУ горада. Кафедра экалогіі прадставіць аналіз уплыву прамысловага выкарыстання драўніны на стан біярэсурсаў Рэчыцкага раёна, кафедра геалогіі — аналіз уплыву нафтаздабычы на якасць прыроднай вады. Біялагічны факультэт азнаёміць з вынікамі вывучэння ўздзеяння радыяцыйнага забруджання на флору, фауну і стан здароўя насельніцтва раёна, з вопытам экалагічнага выхавання дзяцей. Праблемы псіхалагічнага здароўя насельніцтва рэгіёна ў постчарнобыльскі перыяд будуць прадстаўлены кафедрай псіхалогіі. Мы ініцыіравалі таксама тэмы, звязаныя з духоўнай экалогіяй, з праблемай захавання гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіёне.

Наогул мы лічым, што наспеў час для заключэння з Рэчыцкім гарвыканкамам доўгатэрміновага комплекснага дагавора аб супрацоўніцтве, які прадугледжваў бы сярод іншых накірункаў і праблему падрыхтоўкі універсітэтам спецыялістаў для горада і рэгіёна. Тым больш, што і ў гэтай справе таксама ёсць вопыт — ужо некалькі год лепшыя выпускнікі Рэчыцкага ліцэя атрымліваюць вышэйшую філалагічную адукацыю на базе ГДУ па скарочанай праграме.

У цэлым жа мы вельмі станоўча і з удзячнасцю ацэньваем наш вопыт менавіта навуковага супрацоўніцтва з Рэчыцкім гарадскім выканаўчым камітэтам, лічым, што ён можа стаць прыкладам і для іншых рэгіянальных адміністрацый. Ад сябе асабіста шчыра віншую Мікалая Мікалаевіча з узнагародай!

Памятные поездки

# СТУДЕНТ ЮРФАКА – О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ООН

**Центр международной политической жизни в прошедшем сентябре, безусловно, находился в Нью-Йорке. Здесь под эгидой Организации Объединенных Наций прошел "Саммит тысячелетия". В его работе участвовали руководители более 150 стран, в том числе и Республики Беларусь.**

**Следует отметить, что это историческое мероприятие посвящалось 55-летию ООН, членами которой являются более 180 государств. Думается, что нашим читателям интересно знать, как организована деятельность этой весьма авторитетной и влиятельной организации.**

**Своими впечатлениями об ООН поделился в интервью нашей газете четверокурсник юридического факультета Павел Репьевский.**



**НА СНИМКЕ:** Павел Репьевский и миссис Аннан в резиденции Генерального секретаря ООН.

***Вопрос, который напрашивается сам собой: встречи с Америкой в твоей жизни — это личное устремление или судьба?***

— Впервые это произошло чисто случайно, но та поездка подстегнула меня серьезно заняться английским языком. Все последующие посещения США — результат побед на отборочных турах и конкурсах. Большое спасибо моим учителям! Ведь именно качество нашего образования позволило мне и в американской школе, и в колледже быть в числе первых, попасть на практику в Секретариат ООН.

***— Чем конкретно пришлось там заниматься?***

— Участвовал в осуществлении различных проектов ООН, занимался подготовкой и распространением информации, выполнял различные компьютерные работы, посещал конференции, обеспечивал организацию культурного досуга сотрудников и гостей ООН. Практика носила познавательный и ознакомительный характер, в результате чего мне удалось более детально узнать об ООН, структуре, задачах и методах работы этой организации. Вместе со мной работали студенты из Канады, Чехии, Аргентины, Бразилии, Германии. Все мы практиканты-волонтеры, прошедшие по конкурсу на работу в ООН, получали только стипендию от той организации (в моем случае —АКСЕЛС), которая направляет на обучение.

Организация Объединенных Наций не является коммерческой структурой и поэтому старается по максимуму привлекать волонтеров. Ежегодно находится большое количество людей, желающих безвозмездно поработать на благо мировой общественности. Так, в Секретариате есть отдел по организации досуга и проживания сотрудников. Все работающие в нем — волонтеры. Большая часть из них — пенсионеры, домохозяйки, студенты, которые с пользой для общества организуют свое рабочее время. Но есть и люди, которые отдают этой добровольной деятельности один свой выходной в неделю.

На штатной работе состоит лишь руководитель отдела, который составляет расписание и следит за работой. Этот отдел далеко не единственный, где работают волонтеры. Каждое лето только в штаб-квартире ООН в Нью-Йорке проходят практику сотни студентов из разных стран, а координацией волонтерской деятельности в других странах занимаются региональные представительства ООН и специально созданный офис в Германии.

***— Какое отношение к себе чувствовал во время работы в ООН?***

—Вообще отношение к волонтерам очень доброжелательное, их работу по достоинству оценивают сотрудники и высшие должностные лица. Мне даже посчастливилось попасть на прием, организованный женой Генерального секретаря ООН Кофи Аннана — миссис Аннан. Мы получили приглашение на чай в их резиденцию на Первой Авеню в Нью-Йорке. Атташе по социальным делам представил миссис Аннан каждого гостя, хозяйка приема уделила внимание каждому из нас, каждого лично поблагодарила за работу. Все были тронуты таким вниманием. Подобное отношение официальных лиц во много раз повышает желание людей посвятить часть своего свободного времени безвозмездному служению обществу. Думаю, что многим нашим руководителям нужно поучиться такому методу проявления благодарности.

***— В Штаб-квартире ООН в Нью-Йорке расположены Генеральная Ассамблея, Совет Безопасности, Экономический и Социальный Совет, Секретариат. Кроме того, в организацию входят четырнадцать специализированных учреждений: ЮНЕСКО, Международный Валютный Фонд, Всемирный банк, Всемирная организация здравоохранения... Какая же структура управления ООН и какова эффективность ее работы?***

— Да, организация действительно большая и насчитывает порядка 65 тысяч сотрудников, в том числе около 9 тысяч работает непосредственно в Секретариате. Секретариат, возглавляемый Генеральным секретарем, является основным координатором, обеспечивающим согласованную работу других органов ООН. Он обеспечивает выполнение решений и рекомендаций Генеральной Ассамблеи, Совета Безопасности и т.д. В работе Секретариата принимают участие сотрудники из 170 стран мира. Мне повезло попасть на практику именно в Секретариат.

Комплекс зданий ООН — это маленький город, где есть все: офисы, банки, библиотеки, страховые агентства, клубы по интересам, классы по изучению различных предметов и языков, столовые и кафетерии. Здание Секретариата — это 40-этажный небоскреб, открытый круглосуточно для сотрудников, имеющих специальные пропуска. Мне тоже был выдан такой пропуск. Секретариат напрямую связан с залом Генеральной Ассамблеи, где и происходят заседания с сентября по декабрь. Установлены шесть официальных рабочих языков Ассамблеи, в том числе и русский. Для успешной работы Секретариата предусмотрен штат переводчиков-машинисток, используется современное компьютерное оборудование, информационное обеспечение и множительная техника. Все это позволяет оперативно информировать о принятых решениях и получать необходимую документацию практически на всех языках. Кроме того, использование мобильной связи и Интернета дает возможность осуществлять, на мой взгляд, эффективное управление всей сложной структурой.

***— Приходилось ли тебе бывать в зале Генеральной Ассамблеи — там, где творится мировая история?***

— Зал, конечно, впечатляет, но мне бы хотелось рассказать вот о чем. Традиционно повелось, что каждое государство, член ООН, дарит подарок. Чаще всего картины, статуэтки, памятники. Например, композиция "Перекуем мечи на орала", подаренная ООН Советским Союзом в 1956 году, большой слон, подаренный Индией, колокол мира, подаренный Японией... Впечатляет подарок Республики Беларусь, врученный ООН в 1991 году. Это большое тканое полотно, выполненное в современной манере, которое занимает всю стену, как раз около зала Генеральной Ассамблеи. Состоит композиция из трех частей, символизирующих наше прошлое, настоящее и будущее. В прошлом изображены достояния белорусской истории, первый книгопечатник Ф.Скорина, музыканты, поэты. Настоящее Беларуси ассоциируется с чернобыльской катастрофой — страна борется с последствиями взрыва. А будущее — мирная жизнь, залитая солнечным светом, играющие дети. Возрождение страны символизирует поднимающийся мальчик. Композиция смотрится очень

(ОКОНЧАНИЕ на 4-й стр.)

Успаміны аб летняй практыцы

# ШМАТ ЦІКАВАГА Ў РОДНЫМ КРАІ

**На другім курсе ў студэнтаў-географаў у вучэбным плане з'яўляецца новы прадмет — "Тэхніка-эканамічныя асновы вытворчасці". Нягледзячы на яго "сухую" назву, вынік апраўдаў усе нашы спадзяванні. Разам з цікавай, па-свойму сухаватай тэорыяй нам давялося шмат пабачыць на ўласныя вочы.**

Дзякуючы нашаму выкладчыку Уладзіміру Яўгенавічу Пашуку ў адзін цудоўны сонечны дзянёк мы апынуліся на тэрыторыі Гомельскага тлушчакамбіната. Мэтай нашага візіту туды было вывучэнне тэхналогіі вытворчасці мыла.

Леанід Іванавіч Аляшкевіч, галоўны тэхнолаг прадпрыемства, правёў нас па мылаварнаму цэху, адказаў на пытанні, якія нас цікавілі. Мы даведаліся, што тут вырабляюць такія гатункі мыла, як "Сунічнае", "Гліцэрынавае", "Дзіцячае", для гаспадарчых патрэб.

А потым нас чакала летняя выязная практыка, аб якой так мараць усе студэнты геафака з першага дня свайго вучобы. Менавіта ж у палявых умовах мы становімся сапраўднымі географамі. Праўда, замест паездкі ў Нарачанскі цудоўны азёрны край нам далі магчымасць спазнаць прыгажосць родных мясцін, атрымаць асалоду ад краявідаў вакол Сожа, Дняпра і Прыпяці.

На адлегласці 30 км ад Гомеля, сярод лясоў, стаіць на беразе рэчкі невялікая вёсачка Старыя Дзятлавічы. Менавіта адсюль і пачаўся адлік нашай летняй практыкі. Яркае сонейка, цудоўная прырода, разнастайныя формы рэльефа і ласкавыя воды Сожа былі нашымі спадарожнікамі на працягу дзесяці дзён. Добра прынялі нас і мясцовыя жыхары, якія надоўга застануцца ў нашых сэрцах. Радавалі вока бяскрайнія калгасныя палі, на якіх схілялі свае галоўкі каласы пшаніцы. Колькі працы ўкладзена вясковымі жыхарамі ў кожны кавалак зямлі, колькі праліта іх поту над кожным зярняткам і растком!

Вельмі ўразіў свайго веліччу і прыгажосцю магутны Днепр. Не адну старыцу гэтай ракі нам давялося перайсці ўброд, і часам пераплыць. А якім было наша захапленне, калі ўздымаліся на суднабудаўнічую верф, хадзілі па палубе баржы.

Мазыр — гэта райскі куточак. Прыгажосць пакрытых зелянінай яроў адцягвае ад паўсядзённай мітусні. Спевы птушак, пах кветак і прахалодныя воды Прыпяці падтрымліваюць стан бадзёрасці і задаволенасці на працягу ўсяго дня. Не толькі прырода пакарыла нас сваёй прыгажосцю, але і людзі — шчырымі сэрцамі і чысцінёй душы.

З добразычлівымі ўсмешкамі сустрэлі нас на парозе аб'яднання "Мазырдрэў" яго менеджэры С.А.Купусцін і А.А.Пархоменка. З іх дапамогай мы даведаліся аб таямнічымператварэнні дрэва ў цудоўныя творы рук чалавечых, убачылі, з якой цярплівасцю і старannасцю працуюць сотні людзей над кожнай дэталлю. Асартымент прадпрыемства складае каля 80 назваў. Гэта рэчы, без якіх мы не можам уявіць сваё жыллё — сталы і стулы, тумбачкі і шафы, кухонныя і гасціныя гарнітуры. Пра мэблю, якая вырабляецца на ААТ "Мазырдрэў", вядома не толькі ў краінах СНД, але і ў Галандыі, Германіі, Венгрыі.

Далёка за рысай горада знаходзіцца вядомае ў Беларусі і за яе межамі адкрытае акцыянернае таварыства "Мазырсоль". Але, напэўна, мала хто ведае, як соль з нетраў зямлі трапляе на наш стол. Здабываюць яе на адлегласці трох кіламетраў ад прадпрыемства на глыбіні 1200м спосабам вымывання. Далейшы шлях ачысткі і апрацоўкі солевага расолу мы змаглі прасачыць з дапамогай інжынера-тэхнолага Л.П.Моніна. Прадукцыя ААТ "Мазырсоль" з'яўляецца пераможцай на многіх міжнародных конкурсах, яе якасць прызнана ва ўсім свеце.



Пабывалі мы і на Мазырскім піваварным заводзе. Аб праблемах, планах і перспектывах прадпрыемства нам расказала Л.А.Рыхцікава. З вялікай цікавасцю мы назіралі, як варацць сусла, як адбываецца працэс бражэння і атрымліваецца гатовае піва —"Жыгулёўскае", "Маскоўскае", "Аматарскае" і іншых гатункаў. Вырабляюць тут і квас, вялікі асартымент безалкагольных напіткаў.

З вялікай неахвотай пакідалі мы палескую глыбінку і вярталіся ў свой родны горад, дзе нас ужо чакалі на заводзе станочных вузлоў. Мы пабывалі ва ўсіх цэхах, на ўласныя вочы ўбачылі некалькі мадэляў толькі што спушчаных з канвеера токарных станкоў і іншую прадукцыю завода.

На гэтым наша падарожжа па Гомельшчыне не скончылася. Яшчэ быў час, і мы вырашылі з'ездзіць у горад Добруш, які даўно вабіў сваёй славай. Тут мы наведалі не менш вядомае прадпрыемства ў Беларусі і за яе межамі — фарфоравы завод. Звон пасуды і пах лаку з фарбай так і цягнуў паглядзець на майстроў, што робяць цуд з кавалка гліны. Дзякуючы Т.В.Бурмістравай мы даведаліся, як зрабіць фарфоравую маску, на які станок яе падаць, як і колькі трымаць пасуду ў печах для абпальвання, каб потым мы змаглі ёю карыстацца.

Цяпер мы таксама своеасаблівыя майстры і пра многае зможам расказаць сваім будучым вучням. Практыка, як мы аднадушна лічым, прайшла на славу. Мы шмат пабачылі, шмат пра што даведаліся і ўдзячны таксама яшчэ аднаму нашаму кіраўніку — дацэнту кафедры геаграфіі А.І.Паўлоўскаму.

**Таццяна ФЛЕРКА,**
**студэнтка гр.ГН-3 геолага-геаграфічнага факультэта.**

Памятные поездки

# СТУДЕНТ ЮРФАКА – О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ООН

(ОКОНЧАНИЕ. НАЧАЛО на 3-й стр.)

эффектно. Я долго стоял, рассматривая это полотно, и чувствовал гордость за свою страну, за белорусов, которые, несмотря на кризисный период, не потеряли способность создавать такие шедевры.

***— Была ли у тебя возможность увидеться с Генеральным секретарем ООН? Какие еще интересные встречи и события произошли в период твоей работы в ООН?***

— Я принимал участие в конференции ООН, на которой выступал Кофи Аннан, а также видел его несколько раз во время интервью в фойе ООН. Он производит впечатление очень занятого, но, вместе с тем, общительного человека, лишенного национальных и расовых предрассудков.

Надо отметить, что Генеральный секретарь согласно Уставу ООН является главным должностным лицом Организации. Назначается он Генеральной Ассамблеей ООН по рекомендации Совета Безопасности.

За последние 30 лет существует негласная традиция назначать на эту должность людей из разных региональных групп — Азия, Европа, Латинская Америка, Африка. Например, Кофи Аннан — из Ганы, а его предшественник — Бутрос Гали — из Египта. Интересный факт: хотя законодательно нет ограничений на количество пятилетних сроков нахождения на этом посту, ни один из генеральных секретарей не занимал его более двух раз.

Что же касается знаменательных событий, то в июне в ООН прошло мероприятие, которое просто не могло оказаться незамеченным в дипломатической среде и в котором мне удалось принять участие — символическое подписание Устава ООН, приуроченное к 55-летию создания самой Организации и принятия Устава. Представители каждой страны должны были со статутом в руках в торжественной обстановке пройти символический круг около здания ООН, а затем передать его следующей стране. Страны шли в алфавитном порядке. От Беларуси в этом шествии приняли участие Глава Постоянного Представительства А.Н.Сычев и Третий Секретарь Посольства К.Акопов. Участники своими подписями скрепили символическую копию Устава ООН.

***— Связь Организации Объединенных Наций с государствами, входящими в ее состав, осуществляется через иностранных работников Секретариата или по-иному?***

— Работники Секретариата не ассоциируются со страной своего происхождения, а считаются международными сотрудниками, работающими, чаще всего, по контракту.

Каждое государство — член Организации — имеет постоянное представительство при ООН. Возглавляет миссию посол (постоянный представитель). В постоянном представительстве Республики Беларусь при штаб-квартире ООН в Нью-Йорке работает, например, восемь человек, в то время, как миссия Российской Федерации насчитывает более 70. Их основная задача — налаживание и развитие политических, экономических, научно-технических и культурных связей. В этих целях широко используются мероприятия и встречи, организуемые в связи с национальными и американскими праздниками.

Так, миссия Республики Беларусь 3 июля в связи с Днем Независимости страны устраивала прием. Мероприятие это было чрезвычайно интересным и познавательным. Кроме членов белорусского представительства были приглашены зарубежные дипломаты, сотрудники других миссий, отделов ООН, работники Секретариата, в том числе и я, представители белорусской диаспоры, проживающие в Нью-Йорке. Организаторы приема старались не обделить вниманием гостей, не говорящих по-русски. Беседы были на разные темы — от политики и экономики, до проблем белорусской эмиграции. Весь вечер шло неформальное общение. Такие встречи сближают людей и еще раз помогают понять, что все мы хотим жить в лучшем мире, и к этому должны стремиться.

***— ООН заботится не только об организации своей деятельности, но и уделяет внимание отдыху своих сотрудников?***

— Организация Объединенных Наций обеспечивает сотрудников не только работой, но и старается разнообразить их досуг, организует экскурсии, поездки, ярмарки, дни отдыха. В подготовке одного такого дня мне удалось поучаствовать. Называется он "июньский день ООН" и проходит ежегодно в последнюю субботу июня вот уже на протяжении 35 лет. Организовывает это мероприятие вдова одного из дипломатов, известная в ООН волонтер, которой недавно исполнилось 80 лет. В этот день члены ООН с семьями и друзьями собираются в соседнем штате Коннектикут, в городке Вестпорт. Сотрудники оплачивают только проезд, все остальное предоставляет мэрия и общественность города. У гостей есть возможность совершить прогулку на яхте по океану, поиграть в теннис и гольф, поплавать в бассейне, посетить городок аттракционов. Хозяева обеспечивают также завтрак и обед, музыкально-культурную программу.

Большой интерес для сотрудников ООН представляют познавательные туры по главным достопримечательностям Нью-Йорка и штата. Мне удалось созерцать одну из них — Ниагарские водопады, что на границе США и Канады. Шум падающей воды слышен за 20 километров. Вокруг стоит облако водяных брызг, все сверкает и переливается на солнце. Смотришь на величие этого природного чуда и невольно сравниваешь его с ООН, которая, как могучая река, вбирает в себя интересы всех стран и народов, а затем низвергается мощным потоком решений, деклараций и акций, поддерживающих мир, независимость и свободу.

***— Значительное место в деятельности ООН занимает борьба за разоружение. Проводились ли мероприятия в этом направлении во время твоей практики?***

— К сожалению, такие специальные мероприятия ООН на момент моего пребывания не проводились. Но для того, чтобы сотрудники лучше знали возможности современной военной техники, ее уничтожающий потенциал, для нас была проведена экскурсия на большой авианосец и атомную подводную лодку. На взлетной полосе авианосца размещалось множество самых современных самолетов и вертолетов. Нам даже показали самолет-невидимку. Мне также запомнилось посещение атомной подводной лодки. После такой экскурсии особенно остро понимаешь необходимость мирного сосуществования всех народов на Земле.

***— С какими же мыслями и настроением ты вернулся домой? Что лично дало обучение в США и практика в ООН?***

— Сегодня я, как, надеюсь, и большинство моих сверстников, понимаю, что образование — это тот стартовый капитал, с которым мы вступаем во взрослую жизнь. А опыт проживания и обучения в иной языковой и социально-психологической среде — это отличная школа жизни. И чем больше молодых людей пройдут эту школу, тем больше пользы они смогут принести своей стране. Каждый год Американским Советом по Сотрудничеству в области образования и изучения языков (ACCELS) проводится конкурс. Из числа школьников и студентов отбираются лучшие, которые выезжают затем на обучение в США. Получить подробную информацию об этих программах можно в информационном центре ACCELS) по адресу: г.Гомель, проспект Ленина,10, комн.545.

Понял я и то, что нельзя сегодня развиваться и строить государственную политику без учета сложившейся структуры международных отношений. Беларуси следует как можно быстрее и в полном объеме интегрироваться в мировое сообщество. И если говорить о будущем, надо думать о мире, сотрудничестве, активном участии во всех международных делах. Это позволит использовать новейшие технологии, получать необходимые инвестиции и поднять уровень жизни белорусов до уровня развитых стран мира. Очень хочется быть непосредственным участником всех этих событий.

## У ПОШУКАХ ТАЯМНІЦ

Члены Беларускага патрыятычнага саюза моладзі ГДУ імя Ф.Скарыны даўно хацелі адправіцца ў паход, але не ў просты, а ў экспедыцыю па даследаванню і вывучэнню спадчыны продкаў. Рабяты хацелі даведацца больш падрабязна аб гісторыі сваёй Радзімы, што-небудзь для гэтага зрабіць. Нарэшце ім давялося адправіцца ў экспедыцыю. Яе дапамог арганізаваць Цэнтральны райкам БПСМ Гомеля.

І вось дзесяць студэнтаў ГДУ разам з сакратаром пярвічкі Святаславам Шаламавым адправіліся ў археалагічную экспедыцыю. Пехатой яны прайшлі да Веткаўскага раёна, пераправіліся на пароме праз возера і трапілі на востраў. У далёкім мінулым тут было першае пасяленне старавераў. У часы Вялікай Айчыннай вайны там акапаліся фашысты, і савецкія салдаты пралілі шмат крыві, каб узяць рубеж.

Нямала папрацавалі рабяты ў пошуках, і іх старанне ўвянчалася знаходкамі: былі выяўлены астанкі двух цел. Па знаках адрознення і гузіках удалося вызначыць, што гэта савецкі і нямецкі салдаты. Рабяты там жа перазахавалі астанкі. Акрамя таго, у час раскопак яны знайшлі мноства керамічных чарапкоў, якія былі перададзены ў Веткаўскі краязнаўчы музей.

Хочацца спадзявацца, што такія археалагічныя экспедыцыі будуць праходзіць больш масава і маштабна. Мы шчыра спадзяемся, што гэта не застанецца захапленнем нямногіх, а пераўтворыцца ў шырокі маладзёжны рух.

**Павел КАВАЛЁЎ і Таццяна КУПЦОВА, члены БПСМ.**

Падгледзеў фотааб'ектыў



**Ох, і цяжкая навука -- гэты пераходны перыяд. Фота У.Чысціка.**

## ГРАМАДСКІЯ ІНСПЕКТАРЫ

У складзе прафкома універсітэта дзейнічае камісія па ахове працы і тэхнікі бяспекі, у якую ўваходзяць чатыры чалавекі. Іх задача — весці праверку і нагляд за захаваннем усіх прадугледжаных правілаў па забеспячэнню належных умоў працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ, няўхільным выкананнем правілаў па ТБ згодна графіка праверкі структурных падраздзяленняў адміністрацыйна-грамадскага кантролю.

Для больш дзейснай работы названай камісіі на прафкоме універсітэта зацверджаны таксама грамадскія інспектары па ахове працы і ТБ на факультэтах і ў структурных падраздзяленнях: у вучэбным корпусе № 1 — яго камендант А.Ф.Падабедава, вуч.корпусе №2 — нам.дэкана матфака У.А.Галавач, вуч.корпусе № 4 — заг.лабараторыі геалогіі і разведкі карысных выкапняў В.Ф.Шабаршоў, вуч.корпусе № 5 — ст.выкладчык кафедры агульнай фізікі У.А.Замятнін, інтэрнатах № 1,2,3,4 — камендант інтэрната № 3 С.М.Шарэнда, гаражах, майстэрнях, аграбіястанцыі "Чонкі" — заг.склада В.В.Варапаева.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— педагогікі — асістэнта;
— беларускай мовы — асістэнта;
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — выкладчыка (2);
— матэматычнага аналізу — дацэнта;
— матэматычных праблем кіравання — асістэнта;
— ВМ і праграміравання — дацэнта;
— псіхалогіі — дацэнта;
— давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі — ст.выкладчыка;
— геаграфіі — ст.выкладчыка;
— рускай літаратуры — асістэнта;
— беларускай культуры — асістэнта;
— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — асістэнта;
— экалогіі — ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Калектыў кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы выказвае глыбокае спачуванне выкладчыкам **ФЛЁШТАР** Валянціне Юр'еўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ** і **СМОЛАВАЙ** Тамары Васільеўне ў сувязі са смерцю **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 553
Падпісана да друку 06.10.2000